Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

9 ЧЭРВЕНЯ 2020 г. АЎТОРАК № 110 (29224)

ГУЛЯЦЬ — У БЯСПЕЦЫ

«ВІРУС ДАБРЫНІ». BYCOVID19

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі:

«У прамысловасці, сферы паслуг ёсць галіны, якія яшчэ адстаюць ад узроўню 2019 года. Гэта ў першую чаргу звязана з тымі абмежаваннямі, якія мы маем у сувязі з каранавірусам на знешнім контуры. Аднак асноўныя нашы гандлёвыя партнёры ўжо пачынаюць здымаць абмежаванні, аднаўляюць работу прадпрыемстваў, узрастае попыт, у тым ліку на беларускую прадукцыю. На аснове гэтых фактараў мы робім высновы, што эканоміка пачне аднаўляцца ўжо ў III квартале».

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Трэба захаваць тое, што ў нас ёсць. А для гэтага трэба быць як кулак — адзінымі»

Фота БелТА.

З такімі словамі Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка звярнуўся ў суботу не толькі да актыву Магілёўскай вобласці, якую наведаў з рабочым візітам, але і, бадай, да ўсіх беларусаў. Аднак спачатку кіраўнік дзяржавы паглядзеў, як змяніўся абласны цэнтр, з якім звязана яго студэнцкае юнацтва. З вышыні птушынага палёту, калі аблятаў горад на верталёце, і потым — на месцы, якое магіляўчане цяпер не толькі любяць, але ганарацца ім — у Падмікольскім парку.

«Горад павінен быць прыгожы»

Тут заўсёды ёсць людзі — самых розных узростаў, але нязменна ў добрым настроі. Дзеці з задавальненнем гуляюць у вяровачным гарадку, дарослыя займаюцца спортам і адпачываюць, любуюцца сваім горадам, з гордасцю знаёмяць з ім гасцей... Дарэчы, у парку больш за шэсць кіламетраў тратуараў і больш за тры кіламетры веласіпедных дарожак.

Прэзідэнту расказалі, што ўжо ёсць дамоўленасць на стварэнне гасцінічнага комплексу. Прадугледжана будаўніцтва парку атракцыёнаў, пашырэнне пляжнай зоны. Актыўна будуецца Свята-Пакроўская царква — на гістарычным фундаменце і за грошы вернікаў.

Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід Заяц далажыў аб асноўных паказчыках сацыяльна-эканамічнага развіцця вобласці.

СТАР. 2

Правільная дарога

Павел РАБЦАЎ, навучэнец Мінскага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя № 5 транспартнага будаўніцтва, праходзіць вытворчую практыку ў кампаніі «Профіслаў-буд», якая ўстанаўлівае і мадэрнізуе святлафорныя аб'екты. Гэтымі днямі брыгада, у якой працуе будучы электрык, вядзе мантаж святлафорнага абсталявання на перакрыжаванні мінскіх вуліц Варанянскага і Жукоўскага, каля ўваходу на новую станцыю метро «Кавальская Слабада», якая рыхтуецца да адкрыцця. На пытанне, чаму ён выбраў такую прафесію, Павел не задумваючыся адказаў: «Мой дзядуля быў класным электрамантажнікам і электрамеханікам, хоць і не меў спецыяльнай адукацыі, таму і я вырашыў пайсці таксама па гэтай дарозе, але ў першую чаргу набыць веды, практыку і дыплом».

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

КОРАТКА

- **Памочнікі Прэзідэнта на бягучым тыдні правядуць прамыя тэлефонныя лініі.**
- «Беларуснафта» зрабіла першую прапампоўку АІ-95 праз нафтапрадуктапровод Наваполацк—Фанідаль.

- **Прыём дакументаў у першыя класы школ Беларусі пачнецца 12 чэрвеня.**
- НАН падрыхтавала новы падручнік па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.
- **Прызыўнікі будуць прымаць прысягу без родных і блізкіх.**
- Памёр заслужаны трэнер Беларусі па кулявой стральбе Уладзімір Чайка.
- **БРСМ запускае сямейны інтэрнэт-чэлендж «#раЗАм з бацькам».**
- ЮНІСЕФ правядзе вэбінары псіхалагічнай падтрымкі для супрацоўнікаў дамоў-інтэрнатаў.

Рэпарцёр

Новая лагістыка турыстычнай жамчужыны

Карэспандэнт «Звязды» праехала на ровары ад Сапоцкіна да Аўгустоўскага канала

Сёлетні турыстычны сезон адзначыўся прыемным падарункам для аматараў веларуху: 100 новенькіх роваў закуплены ў рамках трансгранічнага праекта «Аўгуст Вела», які рэалізуецца сумесна з польскім бокам. Гэта дазволіла адкрыць на канале адразу некалькі пунктаў пракату, у тым ліку ў аграгарадку Сапоцкін, адкуль пачынаецца знаёмства з інфраструктурай усёй турыстычнай мясцовасці.

СТАР. 13

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!